# У чаканні абітурыентаў



Студэнты на размеркаванні. Фота аўтара

**Прыёмная кампанія набірае абароты. Ужо прайшлі экзамены для тых, хто паступае ў ВНУ на мэтавую падрыхтоўку. Неўзабаве распачнуцца іспыты для іншых. Што новага чакае творчую моладзь ва ўніверсітэтах нашай сферы, даведалася "К".**

## СІНАЛОГІЯ Ў БДУКМ

Як адзначае рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт **Наталля Карчэўская**, прыём дакументаў ад абітурыентаў, якія паступаюць па мэтавым наборы, аказаўся даволі паспяховым.



Наталля КАРЧЭЎСКАЯ

— На ўсе спецыяльнасці быў конкурс, — гаворыць Наталля Карчэўская. — На некаторыя даходзіў да трох чалавек на месца. Абітурыенты добра падрыхтаваныя, адчувалася яўнае жаданне атрымаць упадабаную спецыяльнасць, і гэта для нас радасна.

Увогуле, сёлета, як і заўжды, падчас прыёму ў першую чаргу робіцца акцэнт на патрэбы сферы культуры. Як заўважае рэктар БДУКМ, плануецца набраць студэнтаў на 15 спецыяльнасцей і 28 прафілізацый. Сярод найбольш актуальных на рынку працы — "Харэаграфічнае мастацтва — эстрадны танец", "Рэжысура свят", "Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць", "Сацыяльна-культурная дзейнасць".

— Сёлета плануем прыняць навучэнцаў на новую прафілізацыю "Сіналогія" па спецыяльнасці "Культуралогія" (факультэт культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці), — адзначае Наталля Карчэўская. — Хоць і набіраем студэнтаў на сіналогію ўпершыню, гэты новы напрамак даволі перспектыўны ў сувязі з цеснымі кантактамі Беларусі з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Да таго ж мы яшчэ ў 2021-м адкрылі філіял кафедры культуралогіі ў Рэспубліканскім інстытуце кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ. Студэнты прафілізацыі "Сіналогія" стануць вывучаць мову, культуру, гісторыю Кітая і шмат што яшчэ. Мяркую, падобныя спецыялісты будуць вельмі запатрабаванымі.

Каб зацікавіць выпускнікоў школ паступленнем у БДУКМ, была праведзена вялікая прафарыентацыйная работа. І гэта не толькі дні адкрытых дзвярэй, што ладзіліся ва ўніверсітэце і на ўсіх факультэтах літаральна штосуботу, але і выезды ў розныя рэгіёны краіны.

— Напрыклад, у Пінску ў рамках серыі прафарыентацыйных мерапрыемстваў студэнты кафедры тэатральнага мастацтва паказалі на сцэне Палескага драматычнага тэатра свой спектакль, — распавядае Наталля Карчэўская. — Таксама мы сустрэліся з навучэнцамі Пінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў і старшакласнікамі сярэдніх школ горада, расказалі пра нюансы паступлення ў БДУКМ, свае планы. Адметна, што ў гэтай працы задзейнічаны нашы студэнты, у якіх нават бралі аўтографы! Сапраўды, хто лепш можа распавесці пра ўніверсітэт, як не самі навучэнцы? І вынікі ад іх далучанасці, іх дапамогі ўстанове — навідавоку.

Па словах Наталлі Карчэўскай, з ліпеня для тых, хто збіраецца паступаць у БДУКМ, пачнуцца двухтыднёвыя курсы, і на іх ужо амаль не засталося месцаў. Характэрна, што абітурыентам на час паступлення дадуць інтэрнат. Усе першакурснікі таксама ім забяспечваюцца, прычым тыя, каго прымуць па мэтавым наборы, — на працягу тэрміну навучання цалкам.

## ПРАФІЛІЗАЦЫІ Ў АКАДЭМІІ МУЗЫКІ

Цяпер дзейнічаюць абноўлены Кодэкс аб адукацыі, класіфікатар спецыяльнасцей і кваліфікацый, таму ўступная кампанія ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі таксама звязана з абнаўленнямі.



Алена КУРАКІНА

— У першую чаргу яны датычаць фармату адукацыйных праграм па музычных спецыяльнасцях, — паведаміла рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт **Алена Куракіна**.

Па яе словах, навацыяй стала спецыяльная вышэйшая адукацыя, так званая бесперапынная адукацыйная праграма, што дазваляе атрымаць і кваліфікацыі (як у бакалаўрыяце), і ступень магістра.

— Галоўнае, што ў новым класіфікатары ўсе акадэмічныя музычныя спецыяльнасці з'яўляюцца спецыяльнасцямі бесперапыннай адукацыйнай праграмы з мінімальным для яе тэрмінам навучання ў пяць гадоў, — працягвае Алена Куракіна. — Такім чынам, музыканты, якія паступаюць у акадэмію сёлета, у адрозненні ад тых, хто праходзіць падрыхтоўку ў магістратуры цяпер, атрымаюць ступень магістра, адвучыўшыся менш — усяго пяць, а не шэсць гадоў. Падобных праграм у галіне музычнага мастацтва ў іншых нацыянальных сістэмах адукацыі няма.

Як кажа рэктар установы, у нашай краіне ў фармаце бесперапыннай адукацыйнай праграмы рэалізуюцца найбольш праца— і практыкаёмкія кірункі, колькасць якіх невялікая.

— Гэта, напрыклад, усе медыцынскія спецыяльнасці, "Прыкладная крыптаграфія", "Архітэктура", "Хімія высокіх энергій", "Ядзерная фізіка і тэхналогіі" ды некаторыя іншыя, — пералічвае суразмоўца. — А ў сферы мастацтва разам з "Жывапісам", "Скульптурай", "Графікай" ды астатнімі ёсць і нашы пяць — "Музыказнаўства", "Кампазіцыя", "Дырыжыраванне", "Вакальнае мастацтва" і "Музычна-інструментальнае мастацтва".

Да таго ж сёлета ў рамках асобных спецыяльнасцей у акадэміі адкрыюцца прафілізацыі — у адпаведнасці з запатрабаванасцю адмыслоўцаў на рынку працы. А ўвогуле, у 2022—2023 навучальным годзе ва ўстанове было 12 спецыяльнасцей і 24 іх напрамкі ў галіне акадэмічнай музыкі.

## МУЛЬТЫПЛІКАТАРЫ Ў АКАДЭМІІ МАСТАЦТВАЎ

Асаблівасцямі ўступнай кампаніі ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў падзяліўся **Андрэй Анісько** — адказны сакратар прыёмнай камісіі, дэкан факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.



Андрэй АНІСЬКО

— У нас ёсць некалькі спецыяльнасцей, якія набіраюцца раз на два-тры гады, — адзначае Андрэй Анісько. — Вось і сёлета мы прымаем навучэнцаў на "Рэжысуру анімацыі" (мультыплікатары) і "Выяўленчае рашэнне экраннага твора" (мастакі ў кіно і анімацыі). Плюс плануецца новы набор на "Рэжысуру кіно і тэлебачання" (анімацыя і дакументальнае кіно).

Калі гаварыць пра экзамены, дык, па словах адказнага сакратара прыёмнай камісіі, ніякіх змен няма. Так, іспыты для абітурыентаў па мэтавым наборы завяршыліся 13 чэрвеня, а для тых, хто паступае на звычайных умовах, распачнуцца 17 ліпеня (як, дарэчы, і ў іншых ВНУ сферы). Прычым, падкрэслівае Андрэй Анісько, творчы экзамен даволі складаны, ён праходзіць у тры этапы — ацэньваецца кожны. Таму толькі найлепшыя атрымаюць жаданыя студэнцкія білеты.

***

Што ні кажы, а ўступныя іспыты — унікальны шанц суаднесці ўласныя магчымасці з сіламі іншых абітурыентаў і ацаніць свае веды. Галоўнае — не страчваць надзеі, ісці да мэты, нягледзячы на перашкоды. Усім, хто спрабуе патрапіць у ВНУ сферы культуры, жадаем паспяховай здачы экзаменаў і залічэння ва ўпадабаную alma mater.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ